## Узор пазоўнай заявы аб сцвярджэнні нядзейснасці сужэнства

Мясцовасць, дата

**У Міждыяцэзіяльны касцёльны суд у Мінску**
вул. Рэвалюцыйная, 1А
220030 г. Мінск

**Пазоўнік(-ца)** Прозвішча (*калі жанчына – ў дужках пазначыць дзявочае прозвішча*), імя, імя па бацьку; дата і месца нараджэння і хросту; дакладны адрас пражывання з паштовым індэксам; нумары тэлефонаў. (*Калі каталік – дадаць адрас парафіі, да якой належыць*). Адрас e-mail.

**Адказчык(-ца)** Прозвішча (*калі жанчына – ў дужках пазначыць дзявочае прозвішча),* імя, імя па бацьку; дата і месца нараджэння і хросту; дакладны адрас пражывання з паштовым індэксам; нумары тэлефонаў. (*Калі каталік – дадаць адрас парафіі, да якой належыць*). Адрас e-mail.

Шчыра прашу Касцёльны суд у Мінску аб сцвярджэнні нядзейснасці майго сужэнства, заключанага (*дата заключэння сужэнства*) у парафіі (*назва і адрас парафіі*).

Я лічу, што маё сужэнства нядзейснае па прычыне (прычынах): (*неабходна падаць прычыну альбо прычыны нядзейснасці сужэнства, якія адносяцца да Вашай справы. Напрыклад,*

- няздольнасці да прыняцця на сябе істотных сужэнскіх абавязкаў з боку мужчыны (жанчыны) па прычынах псіхічнай прыроды,
- выключэння еднасці і нескасавальнасці сужэнства з боку мужчыны (жанчыны),
- выключэння патомства з боку жанчыны (мужчыны),
- прымусу, боязі з боку аднаго з сужонкаў,
- псіхічнай хваробы,
- імпатэнцыі (няздольнасці да савакуплення з боку мужчыны альбо жанчыны),
- цяжкай заганы распазнавальнага суджэння адносна істотных сужэнскіх правоў і абавязкаў з боку жанчыны (мужчыны),
- палавога бяссілля,
- памылкі адносна канкрэтнай якасці характару асобы (падаць, якой якасці), калі такая якасць стала прычынай заключэння сужэнства,
- увядзення ў зман для дасягнення згоды на заключэнне сужэнства з боку мужчыны (жанчыны),
- альбо іншыя прычыны, такія як алкагалізм, нарказалежнасць, гомасэксуалізм, транссэксуалізм, педафілія, шопагалізм і г.д.) ).

*Далей трэба апісаць у форме* *<u>сачынення</u>* *акалічнасці, перш за ўсё перадшлюбныя, а таксама пасляшлюбныя. Ніжэйпададзеныя пытанні дапамогуць Вам напісаць пазоўную заяву больш змястоўна:*

- Калі, дзе і пры якіх абставінах бакі пазнаёміліся?
- Як доўга трываў час нарачонства і як бакі адносіліся да сябе ў гэтым часе (ці адорвалі адно аднаго сімпатыяй, ці давяралі адно аднаму, ці былі паміж бакамі цялесныя збліжэнні)?
- Ці былі бакі вернымі адно аднаму перад шлюбам?
- Ці заключалі бакі сужэнства ахвотна, дабравольна і з любові, а калі неахвотна, недабравольна, з прымусу і без любові, то якімі матывамі кіраваліся? Калі хтосьці прымушаў, то хто, калі і чым пагражаў?
- З якога асяроддзя і з якой сям'і паходзіць кожны з бакоў (ці гэта сям'я поўная\разбітая, каталіцкая\праваслаўная, атэістычная, практыкуючая\непрактыкуючая веру, без залежнасцяў і паталогіяў\абцяжараная паталогіяй – якой паталогіяй)?
- Які характар мае пазоўніцкі бок, а які адказчыцкі?
- Ці паўставалі паміж нарачонымі сваркі і ці былі расставанні? Калі так, то па якой прычыне (дакладна апісаць сітуацыі). Ці заўважалі Вы перад шлюбам схільнасць другога боку да алкаголю, наркотыкаў, ці іншых злоўжыванняў?
- Як адбылося заключэнне грамадзянскага саюза у ЗАГСе? Ці былі вырашаныя перадшлюбныя фармальнасці ў той жа самай парафіі, дзе адбыўся касцёльны шлюб, а калі не, то ў якой (назва парафіі, адрас і дата)? Як адбыўся касцёльны шлюб? Ці не здарылася штосьці асаблівае? Дзе адбылося вяселле і якая была на ім атмасфера?
- Ці бакі пасля шлюбу дапоўнілі сваё сужэнства праз цялесныя збліжэнні і ці маюць сваё патомства? Калі не, то па якой прычыне? Ці мела месца свядомае выключэнне патомства, а калі так, то ад якога моманту? Ці быў хто-небудзь з бакоў бясплодным (імпатэнтам)?
- Дзе і ў якіх умовах бакі пачалі жыць пасля заключэння шлюбу? Як уладкоўвалася жыццё бакоў пасля шлюбу? Ці бакі дбалі адно аб адным і аб сваім сужэнстве? Ці былі бакі самастойныя ў прыняцці важных жыццёвых рашэнняў? Ці залежылі ад іншых асоб, калі так, то ад каго, у якой ступені і ў чым гэта праяўлялася?
- Калі (падаць даты, можна прыблізна), пасля касцёльнага шлюбу, даходзіла да непаразуменняў і што было іх прычынай? Дакладна апісаць сітуацыі, якія давялі да рашэння аб разводзе.
- Хто з бакоў першым пакінуў сужэнскую супольнасць, калі (падаць даты, можна прыблізна) і чаму?
- Хто і з якой падставай звярнуўся ў дзяржаўны суд аб разводзе?
- Ці існуе цяпер магчымасць прымірэння паміж бакамі і працяг супольнага сужэнскага жыцця? Калі не, то чаму?

На пацвярджэнне маёй просьбы падаю наступных сведкаў:

*(Сведкамі могуць быць члены сям'і і знаёмыя, якія добра ведалі бакі ў перадшлюбны і пасляшлюбны час. Трэба падаць двух сведкаў з боку пазоўніка і двух з боку адказчыка)*

1. Імя, імя па бацьку і прозвішча, дакладны адрас пражывання з паштовым індэксам, тэлефоны, парафія, кім з'яўляецца для пазоўніка(цы).
2. Імя, імя па бацьку і прозвішча, дакладны адрас пражывання з паштовым індэксам, тэлефоны, парафія, кім з'яўляецца для пазоўніка(цы).
3. Імя, імя па бацьку і прозвішча, дакладны адрас пражывання з паштовым індэксам, тэлефоны, парафія, кім з'яўляецца для адказчыка(цы).
4. Імя, імя па бацьку і прозвішча, дакладны адрас пражывання з паштовым індэксам, тэлефоны, парафія, кім з'яўляецца для адказчыка(цы).

Беручы пад увагу ўсё вышэйнапісанае, прашу Міждыяцэзіяльны Касцёльны Суд у Мінску прызнаць маё сужэнства нядзейсным, каб я мог (магла) весці сваё жыццё ў адпаведнасці з вучэннем Касцёла і ўласным сумленнем.

___________________________________

***(уласнаручны подпіс)***

**Дадаць да пазоўнай заявы:**

1. *Копію Пасведчання аб заключэнні сужэнства ў касцёле,*
2. *Копію Пасведчання аб хросце;*
3. *Копію рашэння дзяржаўнага суда аб разводзе;*
4. *Іншыя дакументы істотныя для справы, якія на Вашу думку маглі б пацвердзіць нядзейснасць сужэнства (напрыклад, даведка аб лячэнні ў шпіталі, розныя медыцынскія пасведчанні (напрыклад, заключэнне аб пабоях), даведка аб прысудзе па адміністрацыйнай ці крымінальнай справе, прыватная перапіска, фотаздымкі і г.д.)*

***Пазоўная заява павінна быць раздрукаванай на прынтары на адным баку аркуша – адваротны бок застаецца пустым. З левага боку абавязкова павінен быць водступ ад краю аркуша памерам не менш 3 см.***